# ФАРМІРАВАННЕ СІСТЭМЫ САМАКІРАВАННЯ ДЗЯРЖАЎНЫХ СЯЛЯН У БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

***Г. І. Маскевіч***

*Беларускі дзяржаўны універсітэт,*
*пр. Незалежнасці,, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, maskevich@bsu.by*

Разглядаюцца рэформы, якія былі праведзены ў дзяржаўнай вёсцы на тэрыторыі Беларусі пасля далучэня да Расійскай імперыі і да адмены прыгоннага права. Надаецца ўвага фарміраванню органаў сялянскага самакіравання і кіравання, структуры і функцыям валаснога праўлення, сельскага праўлення, іх трансфармацыі і асаблівасцям дзеяння на тэрыторыі Беларусі ў першай палове XIX ст. Раскрыты сутнасныя адрозненні паміж тэрмінамі «сялянская абшчына» і «сельская грамада».

***Ключавыя словы:*** сялянства; рэформа; вёска; самакіраванне; дзяржаўныя сяляне; памешчыцкія сяляне; воласць; валаснае праўленне; валасны старшына; сельская грамада.

# ФОРМИРОВАНИЕ СИСТЕМЫ САМОУПРАВЛЕНИЯ ГОСУДАРСТВЕННЫХ КРЕСТЬЯН В БЕЛАРУСИ В КОНЦЕ XVIII – ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЕ XIX в.

***А. И. Маскевич***

*Белорусский государственный университет,*
*пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, annamaskevich@gmail.com*

Рассматриваются реформы, которые были проведены в государственной деревне на территории Беларуси после присоединения к Российской империи и до отмены крепостного права в 1861 г. Уделено внимание формированию органов крестьянского самоуправления и управления, структуре и функциям волостного правления, сельского правления, их трансформации и особенностям на территории Беларуси на протяжении первой половины XIX в. Раскрыты сущностные отличия между терминами «крестьянская община» и «сельское общество».

***Ключевые слова:*** крестьянство; реформа; деревня; самоуправление; государственные крестьяне; помещичьи крестьяне; волость; волостное правление; волостной старшина; сельское общество.

# FORMATION OF THE SYSTEM OF SELF–GOVERNMENT OF STATE PEASANTS IN BELARUS IN THE LATE XVIII – FIRST HALF OF THE XIX CENTURY

***A. I. Maskevich***

*Belarusian State University,*
*Independence Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus, annamaskevich@gmail.com*

The article considers the reforms that were carried out in the state village on the territory of Belarus after joining the Russian Empire and before the abolition of serfdom in 1861. Attention is paid to the formation of peasant self-government and management bodies, the structure and functions of volost government, rural government, their transformation and

peculiarities on the territory of Belarus during the first half of the nineteenth century. The essential differences between the terms "peasant community" and "rural society" are revealed.

***Keywords:*** peasantry; reform; village; self-government; state peasants; landowner peasants; volost; volost administration; volost foreman; rural society.

Сялянства з'яўлялася самым шматлікім і самым традыцыйным саслоўем у Беларусі на працягу не толькі XIX ст., але і ўсяго перыяду гісторыі. Рэформы, якія актыўна праводзіліся ў Рэчы Паспалітай у XVIII ст., мала змянялі прыгнечанае становічша сялян. У першыя гады пасля далучэння да Расійскай імперыі сацыяльна-прававое становішча сялян Беларусі таксама не зведала значных змен, хоць асобныя новаўвядзенні мелі месца. Прыкметныя трансфармацыі пачаліся толькі ў канцы 1830-х гг. з правядзеннем аграрных рэформ П. Д. Кісялёва ў дзяржаўнай вёсцы і працягнуліся ў 1860-х гг. з адменай прыгоннага права.

Асноўнымі прававымі катэгорыямі сялян пасля далучэння беларускіх зямель да Расійская імперыі заставаліся памешчыцкія і дзяржаўныя. Іх колькасныя суадносіны ў беларускіх губернях былі некалькі іншымі, чым у цэнтральнай частцы імперыі. Дзяржаўныя сяляне ў пачатку XIX ст. складалі 7,5% усіх сялян Беларусі [1, с. 31]. У Расійскай імперыі гэта лічба была значна вышэйшай – каля 40%. Асаблівасцю беларускіх губерняў у першай палове XIX ст. было тое, што ў гэты перыяд назіралася актыўная колькасная дынаміка розных катэгорый сялянства.  Так, па рэвізіі 1815–1825 гг. доля дзяржаўных сялян сярод сялянства Беларусі ўзрасла да 11,8%, а да сярэдзіны XIX ст. складала ўжо 20,6% [1, с. 31]. Звязана гэта было ў першую чаргу з палітыкай канфіскацыі маёнткаў шляхты і перадачы іх у казённае ведамства. Акрамя таго, у Беларусі існавалі тэрытарыяльныя адрозненні ў сацыяльна-прававым становішчы гэтых катэгорый. У цэнтральнай частцы імперыі ўжо з пачатку XIX ст. урад прымаў меры па пашырэнню грамадзянскіх правоў дзяржаўных сялян. У Беларусі ж у канцы XVIII – пачатку XIX ст. становішча памешчыцкіх і дзяржаўных сялян значна не адрознівалася [2, с. 331].

У Расійскай імперыі ўвядзенне асобных элементаў самакіравання ў дзяржаўнай вёсцы пачалося яшчэ ў 1797 г., калі імператару Паўлу І быў прадстаўлены праект раздзялення казёных паселішчаў на воласці і парадку іх унутранага кіравання [3, с. 672]. Рабілася гэта для спрашчэння справаводства, каб «при сочинении ведомостей казённым имениям не различать селений по званиям, но писать целыми волостями, показывая число ревизских душ, земель и угодий» [3, с. 672]. Асноўным элементам самакіравання з'яўлялася валасное праўленне. Сельскія грамады не

ствараліся, але на ўзроўні аднаго паселішча ўводзіліся пасады сельскага старшыны (або выбарнага) і дзесяцкіх, якія выконвалі функцыі памочнікаў валаснoй адміністрацыі. Не існавала дакладных патрабаванняў адносна падзелу губерній на воласці, што было абумоўлена вялікай тэрыторыяй Расійскай імперыі і няроўным размеркаваннем дзяржаўных маёнткаў па колькасці душ і зямель у розных яе рэгіёнах. Адзінае патрабаванне, якое было выказана, – воласць павінна складацца не больш як з 3000 рэвізскіх душ. Абавязак раздзялення губерняў на воласці ускладаўся на губернатараў і казённыя палаты.

У канцы XVIII ст. першыя інстытуты сялянскага самакіравання не мелі шырокіх функцый і паўнамоцтваў, а іх увядзенне павінна было не столькі забяспечыць прыняцце рашэнняў сялянамі, колькі зрабіць больш простай працу кіруючай губернскай адміністрацыі шляхам узбуйнення падсправаздачных адзінак. Гэта яскрава адлюстроўвалася ў функцыянале, якім надзялялася валасная і сельская адміністрацыя. Так, ёй дазвалялася «обнародовать издаваемые узаконения», «толковать, вразумлять и научать» сялян у пытаннях маралі і рэлігіі, «предостерегать» аб парушэнні закона [3, с. 675]. Валасны галава, акрамя таго, сачыў за зборам падаткаў і адбываннем павіннасцяў, а таксама мог вырашаць нескладаныя судовыя спрэчкі. Была вызначана грашовая аплата за службу сялянскай адміністацыі. Валасны галава атрымліваў па 20 руб., сельскі выбарны – па 10 руб. у год [3, с. 674]. Акрамя таго, прадстаўнікі гэтых пасад мелі некаторыя асабістыя ільготы: вызваляліся ад усіх нарадаў і работ, але падаткі дзяржаве працягвалі выплочваць нароўні з іншымі сялянамі. Выдзяляліся сярод прадстаўнікоў адміністрацыі дзесяцкія. Яны абіраліся штомесяц для дапамогі старшыне, таму служылі без аплаты і не атрымлівалі ніякіх падатковых і іншых ільгот.

Ужо пры фарміраванні першага досведу сялянскага самакіравання быў заўважны ўплыў традыцыйных абшчынных каштоўнасцяў, выпрацаваных сялянскім «мірам», на складванне афіцыйнай сацыяльнай іерархіі ў вёсцы. Пры прыняцці рашэнняў пра выбар службовай асобы немалаважным выступаў той фактар, каб прэтэндэнт быў «вельмі ўшанаваны» сярод аднавяскоўцаў. За абразу службовай асобы ці непаслушэнства ўсталёўваліся штрафы і пакаранні. Выбірацца кіраўнікі павінны з сялян «добрых поведением, примерных в хозяйстве, а паче в земледелии и скотоводстве искусных, дабы собою другим подавали пример» [3, с. 674].

У дакуменце 1797 г. былі згадкі і пра сельскі сход, але ён яшчэ не выступаў паўнавартасным органам сялянскага самакіравання. Сельскі сход, які складаўся з прадстаўнікоў кожнага вясковага двара, павінен быў

збірацца па распараджэнні валаснога галавы ў прызначаны ім час для таго, каб «во всякой тишине, что им приказано будет внимать и в точности исполнять» [3, с. 675]. Правам прыняцця рашэнняў такі сход не валодаў, а за невыкананне пастаноў, няяўку на сход альбо «учинение шуму» на ўдзельнікаў накладаліся штрафы.

Такім чынам, у канцы XVIII ст. у дзяржаўнай вёсцы фарміраваліся элементы сялянскага самакіравання. Традыцыя «адказваць мірам», прымаць калектыўныя рашэнні, кругавая парука і сіла грамадскай думкі былі не новымі для беларускай вёскі. Афіцыйнае афармленне сельскай грамады як тэрытарыяльна-адміністрацыйнай адзінкі прынесла новыя элементы ў звычайны сялянскі ўклад, разам з тым адчула на сабе ўплыў традыцыйных абшчынных каштоўнасцяў.

Актыўныя змены ў становішчы дзяржаўных сялян Беларусі пачаліся ў канцы 1830-х гг., калі ў мэтах вырашэння аграрнага пытання быў рэалізаваны шэраг рэформ у дзяржаўнай вёсцы. Іх ініцыятарам і актыўным прыхільнікам стаў міністр дзяржаўных маёмасцяў П. Д. Кісялёў. Адным з напрамкаў рэалізацыі яго рэформы стала змяненне сістэмы кіравання дзяржаўнымі сялянамі. Старт гэтым мерапрыемствам быў дадзены 30 красавіка 1838 г. з прыняццем праекта аб кіраванні дзяржаўнымі маёмасцямі [4, с. 405], паводле якога на тэрыторыі Расійскай імперыі ўводзілася новая сістэма кіравання дзяржаўнымі сялянамі. Складалася яна з чатырох звёнаў, два з якіх ўяўлялі сабой органы кіравання, а два – органы самакіравання. Першым звяном у гэтым ланцужку выступала Палата дзяржаўных маёмасцяў, якая кантралявала тэрыторыю губерні. У сваю чаргу, губерні дзяліліся на акругі пад кіраўніцтвам Акруговага праўлення дзяржаўных маёмасцяў на чале з акруговым начальнікам, якому падпарадкоўваўся штат служачых. Акругі складаліся з валасцей і прыпісаных да іх зямель і лясоў. Першым звяном сялянскага самакіравання з’яўлялася валаснoе праўленне, якое займалася справамі воласці. Самі воласці «складаліся з сельскіх грамад дзяржаўных сялян ўсіх найменняў і вольных хлебаробаў» [4, с. 551]. Валаснoму праўленню падпарадкоўвалася сельскае праўленне, якое стаяла на чале непасрэдна сельскай грамады. Сельская грамада, паводле ўказа, павінна была ствараццa «ў кожным вялікім казённым паселішчы, якая б у ім ні была вялікая колькасць рэвізскіх душ» [4, с. 603]. Паселішчы невялікіх памераў дазвалялася аб’ядноўваць у адну сельскую грамаду. Такім чынам, у сялян з’явілася магчымасць самастойна фарміраваць органы самакіравання.

Важна звярнуць увагу на тое, што тут мае месца менавіта працэс інстытуалізацыі сельскай грамады, якая ў дадзеным выпадку не ідэнтычна паняццю «сялянская» альбо «сельская абшчына». Абшчына як форма арганізацыі сялянскага грамадства існавала і ў папярэднія часы, аднак яна мела больш нефармальнае, традыцыйнае значэнне ў рэгуляванні адносін у вёсцы. Абшчына як форма землекарыстання, а пазней і землеўладання сялян, таксама адрозніваласся ад сельскай грамады як па сваіх функцыях, так і па форме. Сельскія грамады паўсюдна ствараліся на тэрыторыі Беларусі незалежна ад таго, было ў сялян пэўнага рэгіёна абшчыннае (усход) альбо індывідуальнае (захад) землекарыстанне. Безумоўна, ва ўсходніх рэгіёнах Беларусі дзейнасць абшчыны і грамады была шчыльна звязана, часам нават дубліравалася, аднак гэтыя інстытуты не былі ідэнтычныя.

Афіцыйна сельская грамада як частка адміністрацыйнага апарату стала фарміравацца ў канцы 1830-х гг. Такі інстытут першапачаткова ствараўся выключна для дзяржаўных сялян. У сялян прыватнаўласніцкіх такая практыка была ўведзена толькі пасля адмены прыгоннага права ў 1861 г. Аднак аб выкананні сялянскай абшчынай нефармальных функцый самакіравання можна казаць яшчэ ў перыяд росквіту феадальных адносін. Даследчык сялянскай абшчыны XVI–XVIII стст. ў Беларусі В. Ф. Голубеў пры апісанні адносіны сялян і землеўладальнікаў, якія здавалі землі ў арэнду, сцвярджаў, што «грамада» дапамагала феадалу кантраляваць эканомаў і арандатараў. Гэта дазволіла зрабіць выснову аб «наяўнасці ў беларускай феадальнай вёсцы пэўных элементаў сельскага самакіравання» [5, с. 7].

На тэрыторыі Беларусі правядзенне рэформы П. Д. Кісялёва мела пэўныя асаблівасці ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі Расійскай імперыі. У снежні 1839 г. быў выдадзены ўказ «Аб кіраванні дзяржаўнымі маёмасцямі ў Заходніх губернях і Беластоцкай вобласці» [6, с. 989]. Да заходніх губерняў адносіліся ў тым ліку Віленская, Гродзенская, Мінская, Віцебская і Магілёўская. Паводле дакумента для дзяржаўных сялян гэтых тэрыторый ўсталёўвалася свая сістэма кіравання. Звязана гэта было з асаблівым прававым становішчам сялян Беларусі, якія ўсё яшчэ знаходзіліся на так званым «гаспадарчым становішчы». Гэта значыць, працягвалі адбываць паншчыну. Іншыя ж казённыя сяляне былі пераведзены на чынш, таму ўвядзення асаблівых правілаў для іх кіравання не патрабавалася.

Важным адрозненнем правядзення рэформы для беларускіх сялян была наяўнасць трохприступчатай, а не чатырохприступчатай сістэмы кіравання. На тэрыторыі Беларусі адсутнічала такое звяно, як валасное

праўленне, не планавалася падзелу тэрыторыі на воласці. Акругі дзяржаўных маёмасцяў складаліся непасрэдна з сельскіх грамад, прыпісаных да іх запасных казённых населеных і «пустопорожних земель, оброчных статей і лесных округов» [6, с. 1087]. У аснову падзелу на акругі быў пакладзены павятовы падзел.

Функцыянальныя абавязкі служачых кіравання дзяржаўных маёмасцяў у цэнтральнай частцы Расійскай імперыі і ў пяці беларускіх губернях былі ідэнтычнымі, у той час як жалаванне першых і другіх значна адрознівалася. Згодна штатам і табелям акруговы начальнік упраўлення першага разраду ў беларускіх губернях атрымліваў 715 руб., а ў губернях з сялянамі на аброчным становішчы – 2500 руб. у год. Пісцы вышэйшага разраду пры ім атрымлівалі 86 руб. у першым выпадку і 300 руб. – у другім, а жалаванне пісцоў ніжэйшага разраду складала 43 руб. і 150 руб. у год адпаведна [4, с. 121–123; 6, с. 286–288].

У працэсе правядзення рэформы ўдасканальвалася сістэма сялянскага самакіравання як ніжэйшага звяна сельскага кіравання ў дзяржаўнай вёсцы. Яна складалася з трох асноўных элементаў: сельскае начальства, сельскі сход і сельская расправа (выконвала судовыя функцыі). Вясковая адміністрацыя была прадстаўлена сельскім старшыной, якому падпарадкоўваліся 1–3 сельскіх старасты, зборшчыкам падаткаў і даглядчыкам сельскіх запасных магазінаў (дапускалася выкананне гэтых абавязкаў адным чалавекам), сельскім пісарам, дзесяцкімі, лясной вартай і палясоўшчыкамі.

Падобная сістэма самакіравання ўводзілася ў дзяржаўных вёсках, аднак не закранула большую частку сялянства Беларусі, прадстаўленую памешчыцкімі сялянамі. У апошніх органы самакіравання пачалі фарміравацца толькі пасля адмены прыгоннага права ў 1861 г. і мелі пэўныя асаблівасці ў параўнанні з тымі, што існавалі ў дзяржаўных сялян.

Такім чынам, традыцыі сялянскага самакіравання ў Беларусі ў форме сельскай грамады з сельскім сходам і сельскімі службовымі асобамі пачалі фарміравацца яшчэ ў канцы XVIII ст. Больш выразнае юрыдычнае афармленне сельская грамада атрымала ў выніку рэформы дзяржаўнай вёскі П. Д. Кісялёва. Яна была распачата ў 1838 г. і атрымала свае асаблівасці ў Беларусі ў канцы 1839 г. Вопыт самакіравання дзяржаўных сялян быў пакладзены ў аснову стварэння мясцовай адміністрацыі ў ходзе рэформы 1861 г. Аднак сельскія грамады памешчыцкіх сялян мелі адрозненні ад сялян казёнага ведамства.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Сосна У. А. Фарміраванне саслоўна-групавога складу сялянства Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. Мінск: : БДУ, 2000.

2. Гісторыя сялянства Беларусі : у 3 т. / рэдкал. : М. С. Сташкевіч [і інш. ]. Т. 1 : Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. / Я. К. Анішчанка [і інш. ]; пад рэд. В. І. Мялешкі. Мінск: Беларус. навука, 1997.

3. О разделении казенных селений на волости и о порядке внутреннего их управления, 7 авг. 1797 г., № 18082 // Полное собрание законов Российской империи. Собр. 1. СПб., 1830. Т. 24. С. 672–677.

4. Высочайше утвержденный проект учреждения о управлении государственными имуществами в губерниях, 30 апр. 1838 г., № 11189 // Полное собрание законов Российской империи. СПб., 1839. Т. 13. Отд. 1. С. 405–651.

5. Голубеў В. Ф. Сельская абшчына ў Беларусі XVI–XVIII стст. Мінск: Беларус. навука, 2008.

6. Высочайше утвержденное учреждение о управлении государственными имуществами в Западных губерниях и Белостокской области, 28 дек. 1839 г., № 13035 // Полное собрание законов Российской империи. СПб., 1840. Т. 14. Отд. 1. С. 989–1150.